**Дзеепрыслоўе** – гэта нязменная форма дзеяслова, якая абазначае дадатковае дзеянне ў адносінах да асноўнага, выражанага дзеясловам-выказнікам: «Лес, нерухліва **звесіўшы** свае галіны, маўкліва слухаў гэты гімн вясне і маладому жыццю» (Якуб Колас). «Не **спяшаючыся** і **разглядаючыся**, пачаў Лабановіч хадзіць па рынку, **шукаючы** сялянскіх падвод» (Якуб Колас).

У дзеепрыслоўях спалучаюцца асаблівасці дзеяслова і прыслоўя.

Адзнакі дзеяслова – гэта агульнасць асновы і лексічнага значэння: «звоняць у дзверы – звонячы ў дзверы», «вывесіць малюнак – вывесіўшы малюнак»; граматычныя катэгорыі трывання: «сустракаючы (незакончанае трыванне) бацькоў», «развітаўшыся (закончанае трыванне) з гасцямі»; стану (толькі незалежнага): «пакінуўшы (незалежны стан) памяць»; граматычныя прыметы пераходнасці – непераходнасці: «скасіўшы (пераходны) траву», «зазіраючы (непераходны) у вочы», зваротнасці – незваротнасці: «радуючы – радуючыся», «вітаючы – вітаючыся»; здольнасць кіраваць назоўнікамі: «перавозячы падарункі», «узіраючыся ў помнік».

Адзнакі прыслоўя – гэта нязменнасць: «несучы», «пазваніўшы»; прымыканне да дзеяслова: «бегчы не азіраючыся», «чытаць не спяшаючыся».

Марфалагічна час у дзеепрыслоўях не выражаны, значэнне часу ў іх выяўляецца толькі ў адносінах да часу дзеяслова-выказніка. Такім чынам, дзеепрыслоўям уласціва адноснае абазначэнне часу.

Дзеепрыслоўі незакончанага трывання могуць перадаваць адносіны адначасовасці дзеяння з дзеяннем, абазначаным выказнікам: «З другога боку, на поўнач, балоты крыху **адступалі**, **дорачы** людзям пясчанае поле» (І.Мележ); выніку дзеяння ў параўнанні з дзеясловам-выказнікам: «Мяккія, ласкавыя гукі стройным сугалоссем **паліліся** па пакоі, **напаўняючы** яго прыемным звонам і **навяваючы** якіясь добрыя, ціхія чары» (Якуб Колас).

Дзеепрыслоўі закончанага трывання могуць перадаваць адносіны адначасовасці дзеяння з дзеяннем дзеяслова-выказніка: «Адзін край лугу **стыкаўся** з лесам, **уразаўся** ў яго, **адхопліваючы** дугаватыя лукі» (Якуб Колас); папярэднічання дзеяння ў параўнанні з дзеясловам-выказнікам: «Сонца, **зрабіўшы** свой штодзённы кругабег, **апусцілася** зусім нізка» (Б.Сачанка); выніку дзеяння ў параўнанні з дзеясловам-выказнікам: «Дарога **выйшла** на край узгорка, **адкрыўшы** перад намі новыя краявіды» (Я.Скрыган).

У сказе дзеепрыслоўі і дзеепрыслоўныя словазлучэнні выконваюць сінтаксічную функцыю акалічнасці: «Вакол, **ападаючы**, шамацела лісце» (І.Мележ). «Вольхі, **сплёўшыся карэннем**, трымалі адна адну» (І.Шамякін); дадатковага выказніка: «**Апрануўшыся** і **патушыўшы** святло, Васько выйшаў на двор» (А.Асіпенка). Параўн.: Апрануўся, патушыў святло і выйшаў.

Дзеепрыслоўі ў беларускай мове могуць утварацца ад асновы інфінітыва і ад асновы дзеяслова цяперашняга часу (гл. табліцу 1).

**Табліца 1**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| Трыванне дзеепрыслоўя | Спосаб формаўтварэння | Прыклады |
|---|---|---|
| Незакончанае | аснова цяперашняга часу дзеясловаў I спражэння + суфіксы *-учы (-ючы)*;<br>аснова цяперашняга часу дзеясловаў II спражэння + суфіксы *-ачы* (*-ячы*) | пагляда-юць – пагляда-ючы;<br><br>гавор-аць – гавор-ачы |
| Закончанае | аснова інфінітыва (або прошлага часу) + суфіксы *-ўшы* (пасля галосных) і *-шы* (пасля зычных) | звесі-ць – звесі-ўшы;<br>прынес-ці – прынёс-шы |

Ад асновы прошлага часу дзеепрыслоўі ўтвараюцца, калі ў інфінітыве дзеясловы маюць перад суфіксам *-ці* гук [с’]: прывес-ці – прывё-ў – прывё-ўшы; у інфінітыве дзеясловы маюць суфікс *-ну-*, які ў прошлым часе выпадае: высахну-ць – высах – высах-шы; дзеясловы ў інфінітыве заканчваюцца суфіксам *-чы*: спя-чы – спёк – спёк-шы.

У сказе дзеепрыслоўе і дзеяслоў-выказнік, да якога дзеепрыслоўе адносіцца, павінны абазначаць дзеянні адной і той жа асобы ці прадмета: «**Абуўшыся**, **Васіль** заклапочана **пашаргаў** у хату, па-ранейшаму нібы не **заўважаючы** брата» (І.Мележ). «Прыбярэжныя **кусты** ўсё больш і больш **вырысоўваліся**, **выплываючы** з ранішняга змроку, **святлелі**, **развясельваліся**» (Якуб Колас). У прыведзеных прыкладах дзеянні і дзеепрыслоўя, і дзеяслова-выказніка адносяцца да асобы – Васіля – і да прадмета – кустоў. У абагульнена-асабовых сказах асноўнае дзеянне, выражанае дзеясловам-выказнікам, і дадатковае, выражанае дзеепрыслоўем, таксама адносяцца да адной асобы, якая ўяўляецца абагульнена: «Упрошваючы, не намілуешся» (Прыказка). У безасабовых сказах дзеепрыслоўе ўжываецца толькі пры выказніку, выражаным спалучэннем безасабовага дзеяслова ці слова катэгорыі стану з інфінітывам: «На чужы лоб **сягаючы**, **трэба** і свой **падставіць**» (Прыказка). Граматычна памылковым будзе сказ: «Вырашаючы праблемы, нам стала лягчэй». Правільная пабудова сказа: «Вырашаючы праблемы, нам павінна станавіцца лягчэй».

У адным сказе нельга ўжываць дзеепрыслоўе і дзеяслоў-выказнік, якія абазначаюць дзеянні розных асоб ці прадметаў: «**Вяртаючыся** назад, **здарыўся** адзін **выпадак**». Правільная пабудова сказа: «Калі мы вярталіся назад, здарыўся адзін выпадак».

*Т.Я.Старасценка*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ